Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА "Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
_______________ Ю.П.Бондар
"____" _________________ 2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД- _____ / вуч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11- 04 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка)*
*спецыялізацыі 1-23 01 11- 04 01Беларуская мова і літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

**Складальнік**

*А.А.Жэлуновіч,* дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт



**Рэцэнзенты:**

*І.М. Саматыя,* дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Н.Л.Суддзева,* дацэнт кафедры правазнаўства і сацыяльнай тэорыі філіяла дзяржаўнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі “Расійскі дзяржаўны сацыяльны ўніверсітэт” у г. Мінску, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 4 ад 12.11.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 14.12.2010 г.)

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *А.А.Жэлуновіч*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Гісторыя беларускай мовы” з’яўляецца важным звяном у прафесійнай падрыхтоўцы высокакваліфікаванага настаўніка беларускай мовы. Яна знаёміць студэнтаў з моўнай роднасцю славянскіх народаў і вытокамі іх кніжнай культуры. Засваенне гістарычнай граматыкі беларускай мовы забяспечваецца параўнаннем асаблівасцей агульнаўсходнеславянскай мовы-асновы з сучаснай беларускай мовай. Разглядаюцца шляхі развіцця беларускай літаратурнай мовы ад часоў яе ўзнікнення і да нашых дзён.

*Мэтай* дысцыпліны “Гісторыя беларускай мовы” з’яўляецца раскрыццё якасцей беларускай літаратурнай мовы на розных гістарычных этапах з улікам яе граматыка-правапіснага афармлення, развіцця і нармалізацыі фанетычнай сістэмы, граматычнага ладу, слоўнікавага саставу.

*Задачамі* вучэбнага курса з’яўляюцца:

– закласці асновы ведаў экстралінгвістычнага характару: звесткі аб сучасных славянскіх народах і мовах;

– даць звесткі аб умовах узнікнення пісьменнасці ва ўсходніх славян, аб месцы старажытнай беларускай мовы сярод славянскіх моў і яе ролі ў гісторыі беларускай літаратурнай мовы;

– развіць уяўленне аб асноўных беларускіх пісьмовых помніках і гістарычных этапах развіцця беларускай мовы;

– раскрыць асноўныя заканамернасці развіцця фанетычнай сістэмы і граматычнага ладу на моўных з’явах і фактах;

– паказаць шляхі ўтварэння і развіцця функцыянавання беларускай літаратурнай мовы ў розныя гістарычныя перыяды;

– азнаёміць з асноўнымі крыніцамі вывучэння гісторыі мовы – творамі розных жанраў літаратуры, якія адлюстроўваюць пэўныя этапы развіцця беларускай літаратурнай мовы;

– навучыць правільна ацэньваць моўныя з’явы і іх ролю ў нацыянальнай культуры;

– садзейнічаць развіццю культуры навуковага пошуку як аднаго з аспектаў фарміравання прафесійнай культуры высокакваліфікаванага спецыяліста.

Дысцыпліна “Гісторыя беларускай мовы” мае непасрэдныя адносіны да іншых лінгвістычных дысцыплін гістарычнага цыкла (параўнальна-гістарычнай граматыкі славянскіх моў, старaславянскай мовы, гістарычнай дыялекталогіі), да тых, якія вывучаюць сучасны стан мовы і літаратуры (сучаснай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыялекталогіі, гісторыі кнігі, апісальнай граматыкі сучаснай літаратурнай мовы, тэорыі беларускай літаратуры, старажытнай літаратуры), а таксама гісторыю беларускага народа (сацыяльнай гісторыі, археалогіі, этнаграфіі).

У выніку вывучэння дысцыпліны “Гісторыя беларускай мовы” студэнты павінны *ведаць*:

– працэс фарміравання вусна-размоўнай і пісьмова-кніжнай (кадыфікаванай) формаў беларускай мовы;

– законы сістэмнай арганізацыі беларускай літаратурнай мовы на розных этапах свайго гістарычнага развіцця;

– гістарычны аспект фарміравання стылістычнай сістэмы беларускай мовы;

– асноўныя навуковыя працы па гісторыі беларускай літаратурнай мовы.

Студэнты павінны *ўмець:*

– карыстацца тэрмінамі і паняццямі гісторыі беларускай мовы;

– выкарыстоўваць веды па гісторыі беларускай мовы ў вывучэнні сучаснай беларускай мовы і літаратуры;

– выкарыстоўваць атрыманыя тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці;

– выкарыстоўваць галоўныя факты тэарэтычнага курса;

– вызначаць моўныя асаблівасці пісьмовых помнікаў;

– улічваць гістарычныя ўмовы пры аналізе літаратурных пісьмовых помнікаў.

Праграма прадугледжвае выкарыстанне сучасных педагагічных тэхналогій па навучанні камунікацыйным формам зносін, інфармацыйнай дзейнасці, развіцці культуры навуковага пошуку і мыслення з прымяненнем розных метадаў і спосабаў выкладання тэарэтычнага матэрыялу, усемагчымых тэставых заданняў, трэнінгаў па перакладзе старажытных тэкстаў, аналізу літаратурных крыніц, семінараў-дыспутаў.

Такія тэхналогіі па фарміраванні разнастайных кампетэнцый, разуменні навуковай і навучальнай інфармацыі, развіцці прафесійнай эрудыцыі актуалізуюць веды, акрэсліваюць сферу іх прымянення ў практычнай дзейнасці, арыентуюць на пастаяннае самастойнае папаўненне ведаў з прымяненнем апошніх навацый як навуковых, так і метадычных.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Гісторыя беларускай мовы” ўсяго адведзена 214 гадзін, з якіх 84 – аўдыторныя заняткі (60 – лекцыі, 24 – практычныя).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практычныя |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| ***Раздзел 1.Фанетыка*** | | | |
| *Тэма 1.* Фанетычная сістэма ўсходнеславянскай мовы | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Фанетычныя змяненні дапісьмовай эпохі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Фанетычныя змяненні пісьмовай эпохі | 2 | 2 | |
| *Тэма 4.* Фанетычныя змяненні, не звязаныя са стратаю рэдукаваных | 4 | 2 | 2 |
| ***Раздзел 2. Марфалогія*** | | | |
| *Тэма 5.* Характарыстыка марфалагічнага ладу ўсходнеславянскіх гаворак старажытнага часу | 2 | 2 | |
| *Тэма 6.* Назоўнік. Граматычныя катэгорыі, асновы, асаблівасці тыпаў скланення, сінтаксічныя функцыі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Займеннік. Разрады, марфалагічныя асаблівасці, скланенне і сінтаксічныя функцыі | 2 | 2 | |
| *Тэма 8.* Прыметнік. Разрады, формы, асаблівасці скланення, утварэнне ступеняў параўнання, сінтаксічная роля ў сказе | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 9.* Лічэбнік. Асаблівасці словаўтварэння, скланення, сінтаксічнай спалучальнасці з назоўнікамі і функцыянавання ў сказе | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 10.* Дзеяслоў. Словаўтварэнне, граматычныя катэгорыі і формы дзеясловаў старажытнага часу | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 11.* Тыповыя разнавіднасці дзеяслоўных формаў і іх роля ў сказе | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 12.* Прыслоўе. Утварэнне, значэнне і сінтаксічная роля ў сказе. Ступені параўнання прыслоўяў | 2 | 2 | |
| *Тэма 13.* Службовыя словы. Выклічнікі | 2 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***Раздзел 3. Сінтаксіс*** | | | |
| *Тэма 14.* Гісторыя развіцця сказаў у сінтаксічным ладзе беларускай мовы | 4 | 2 | 2 |
| | | | |
| ***Раздзел 4. Літаратурная мова ўсходніх славян XI – пачатку XIV ст.*** | | | |
| *Тэма 15.* Гісторыя ўзнікнення пісьма і паходжання літаратурнай мовы ўсходніх славян | 4 | 4 | |
| *Тэма 16.* Моўныя асаблівасці пісьмовых помнікаў XI–XIII стст., створаных на тэрыторыі сучаснай Беларусі | 6 | 4 | 2 |
| ***Раздзел 5. Старабеларуская літаратурная мова*** | | | |
| *Тэма 17.* Функцыянальна-стылістычныя разнавіднасці старабеларускай літаратурнай мовы (на матэрыяле помнікаў пісьменства XIV–XVIII стст.) | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 18.* Агляд філалагічных прац і ўмоў развіцця пісьменнасці на беларускай мове ў XVI–XVIII стст. | 4 | 2 | 2 |
| ***Раздзел 6. Новая беларуская літаратурная мова*** | | | |
| *Тэма 19.* Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай культуры, літаратуры і мовы ў пачатку XIX ст. | 2 | 2 | |
| *Тэма 20.* Фарміраванне беларускай літаратурнай мовы ў другой палавіне XIX – пачатку XX ст. | 4 | 4 | |
| *Тэма 21.* Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў паслякастрычніцкі час | 2 | 2 | |
| *Тэма 22.* Асаблівасці функцыянавання беларускай літаратурнай мовы ў 20–30-я гг. XX ст. | 4 | 4 | |
| *Тэма 23.* Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе развіцця | 4 | 2 | 2 |
| **Разам…** | **84** | **60** | **24** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Прадмет і задачы дысцыпліны "Гісторыя беларускай мовы". Месца і значэнне курса "Гістарычная граматыка беларускай мовы" ў сістэме філалагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў па роднай мове і літаратуры.

Крыніцы вывучэння гістарычнай граматыкі. Агляд каштоўных помнікаў старажытнага пісьменства. Метады вывучэння гістарычнай граматыкі.

Звесткі з гісторыі графікі. Гістарычныя ўмовы ўтварэння і развіцця беларускай мовы. Праблема перыядызацыі гісторыі беларускай мовы ў адпаведнасці з гісторыяй Беларусі і эвалюцыяй моўнай структуры.

Прадмет і задачы дысцыпліны "Гісторыя беларускай літаратурнай мовы". Месца курса сярод лінгвістычных дысцыплін гістарычнага цыкла (параўнальна-гістарычнай граматыкі славянскіх моў, старaславянскай мовы, гістарычнай дыялекталогіі), тых, якія вывучаюць сучасны стан мовы і літаратуры (сучаснай дыялекталогіі, гісторыі кнігі, апісальнай граматыкі сучаснай літаратурнай мовы, тэорыі беларускай літаратуры), а таксама гісторыю беларускага народа (сацыяльнай гісторыі, археалогіі, этнаграфіі).

Гістарычны аспект паняцця "літаратурная мова", гістарычная зменлівасць яго зместу, суадносіны з іншымі паняццямі: "нацыянальная мова", "дыялектная мова", "пісьмовая мова", "мова мастацкай літаратуры", "літаратурна-моўная норма".

Гістарычны характар літаратурна-моўнай нормы. Праблема кадыфікацыі нормаў. Стылістычная сістэма беларускай мовы ў гістарычным аспекце.

Крыніцы вывучэння гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Навуковая распрацоўка гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Афармленне яе ў асобную галіну беларускага мовазнаўства. Перыядызацыя гісторыі беларускай літаратурнай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 1. Фанетыка

### *Тэма 1. Фанетычная сістэма ўсходнеславянскай мовы*

Асаблівасці фанетычнай сістэмы ўсходнеславянскай мовы: сістэма галосных (вакалізм), сістэма зычных (кансанантызм), асобныя галосныя. Галосныя поўнага ўтварэння і рэдукаваныя. Рэдукаваныя ***ъ, ь*** і іх пазіцыйныя змяненні (чаргаванне моцных і слабых рэдукаваных). Насавыя галосныя ва ўсходнеславянскім пісьменстве.

Прынцып пабудовы складоў. Складовы сінгарманізм. Адметнасць старажытнага славянскага націску. Методыка фанетычнай інтэрпрэтацыі моўных фактаў.

### *Тэма 2. Фанетычныя змяненні дапісьмовай эпохі*

Вынікі фанетычных змяненняў дапісьмовай пары: першая, другая і трэцяя палаталізацыі заднеязычных ***г, к, х***. Спалучэнне зычных з наступным ***й (j)*** і ўзнікненне гістарычных чаргаванняў ***г:ж, к:ч, х:ш, ск:шч, ст:шч, з:ж, с:ш, д:дж, д:ж, т:ч, губны + л’, л:л’, н:н’, р:р’.*** Спрашчэнне ў спалучэннях зычных. Змяненне ў групах ***дт (dt), тт (tt).*** Змяненне ў спалучэннях ***гв (gv), кв (kv)*** перад **Ѣ** з дыфтонга ***oi.*** Поўнагалоссе. Змяненне пачатковых спалучэнняў ****орт (ort), *олт (olt).*** З гісторыі насавых галосных. З’яўленне ***о*** на месцы пачатковага ***йэ (je).*** Цвёрдыя, мяккія і паўмяккія зычныя. Абмежаванасць спалучэння зычных.

### *Тэма 3. Фанетычныя змяненні пісьмовай эпохі*

Вынікі страты рэдукаваных ***ъ, ь*** у вакалізме: бегласць галосных, выраўноўванне асноў, пріставыныя галосныя, устаўныя, падаўжэнне галосных ***о, э (е)*** у новым закрытым складзе, чаргаванне ***ро:ры, ло:лы, ле:лі***, другое поўнагалоссе.

Вынікі страты рэдукаваных ***ъ, ь*** у кансанантызме: узнікненне новых груп зычных, спрашчэнне груп зычных, страта канцавога ***л***, замена зычнага ***j*** (ётам), змяненне ***в*** на ***ў***, змяненне цвёрдага ***л*** на ***ў***, зацвярдзенне губных перад зычнымі і на канцы слоў, асіміляцыя ў новых групах зычных, з’явы прыпадабнення (цвёрдых зычных да мяккіх, свісцячых зычных да шыпячых, шыпячых зычных да свісцячых, звонкіх зычных да глухіх, глухіх зычных да звонкіх, у спалучэнні ***дн)***, зліццё свісцячых ***сс→с, зс→с, цс→ц,*** узнікненне падоўжаных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зычных; дысіміляцыя ў новых групах зычных; змяненне звонкіх зычных на канцы слова. Рэдукаваныя ***ы, і*** (напружаныя ***ъ , ь*** ) і іх лёс.

### *Тэма 4. Фанетычныя змяненні, не звязаныя са стратаю рэдукаваных*

Змяненне галоснага ***Ѣ, э (е)*** на ***о (ё)***, канцавога ***э (е)*** на ***о (ё)***, галоснага ***і*** на ***й***; аканне; страта канцавых ***і, у, э (е);*** зліццё галосных; узнікненне дзекання, цекання; развіццё пратэтычных зычных; афрыката ***дж***; зычны ***г***; шыпячыя зычныя; зычныя ***ц, р***; з'яўленне ўстаўных заднеязычных; страта канцавога ***j (й);*** змяненне ***гы→гі, кы→кі, хы→хі.***

## Раздзел 2. Марфалогія

### *Тэма 5. Характарыстыка марфалагічнага ладу ўсходнеславянскіх гаворак старажытнага часу*

Агульная характарыстыка марфалагічнага ладу ўсходнеславянскіх гаворак старажытнага часу. Гістарычная сувязь словазмянення і словаўтварэння, сродкі ўтварэння слоў і словаформаў. З'явы аналогіі і спрошчання. Размежаванне часцін мовы ў старажытныя часы.

### *Тэма 6. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі, асновы, асаблівасці тыпаў скланення, сінтаксічныя функцыі*

Словаўтварэнне назоўнікаў. Катэгорыі роду, ліку, склону.

Старажытныя асновы назоўнікаў. Сучасная тыпалогія скланення назоўнікаў і яе адносіны да старажытных тыпаў іменнага скланення. Страта адрознення па тыпах скланення ў множным ліку. Гісторыя катэгорыі адушаўлёнасці (формаў вінавальнага склону). Рэлікты старой клічнай формы і парнага ліку ў сучаснай беларускай мове.

Сінтаксічная роля назоўніка ў пісьмовых помніках усходніх славян.

### *Тэма 7. Займеннік. Разрады, марфалагічныя асаблівасці, скланенне і сінтаксічныя функцыі*

Разрады займеннікаў і іх марфалагічныя асаблівасці. Словаўтварэнне займеннікаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Скланенне асабовых і зваротнага займеннікаў. Скланенне неасабовых займеннікаў (займеннае скланенне). Гісторыя склонавых формаў неасабовых займеннікаў. Узаемадзеянне цвёрдай і мяккай разнавіднасцей скланення. Змены ў складзе неасабовых займеннікаў.

Сінтаксічныя функцыі займенніка ў сказе.

### *Тэма 8. Прыметнік. Разрады, формы, асаблівасці скланення, утварэнне ступеняў параўнання, сінтаксічная роля ў сказе*

Разрады прыметнікаў па значэнні і іх словаўтварэнне.

Скланенне іменных (кароткіх) прыметнікаў. Гісторыя займенных (поўных) прыметнікаў. Злітная (усечаная) форма прыметнікаў. Гісторыя формаў ступеняў параўнання прыметнікаў. Іменныя і займенныя формы ступеняў параўнання.

Сінтаксічная роля прыметнікаў у пісьмовых помніках усходніх славян.

### *Тэма 9. Лічэбнік. Асаблівасці словаўтварэння, скланення, сінтаксічнай спалучальнасці з назоўнікамі і функцыянавання ў сказе*

Словы з лікавым значэннем ва ўсходнеславянскіх пісьмовых помніках. Фарміраванне катэгорыі лічэбніка як асобнай часціны мовы.

Асаблівасці скланення асобных груп лічыльных слоў. Паходжанне складаных і састаўных лікавых назваў (ад 11 і далей). Гісторыя парадкавых, дробавых і зборных лічэбнікаў.

Лічэбнік як з’ява гістарычнага сінтаксісу.

### *Тэма 10. Дзеяслоў. Словаўтварэнне, граматычныя катэгорыі і формы дзеясловаў старажытнага часу*

Граматычныя катэгорыі і форма дзеяслова ў старажытныя часы. Чатыры тыповыя разнавіднасці дзеяслоўных формаў у ранніх усходнеславянскіх пісьмовых помніках. Інфінітыў. Супін. Асновы цяперашняга часу і інфінітыва.

Асабовыя формы цяперашняга часу дзеясловаў нетэматычнага і тэматычнага спражэння.

Гісторыя формаў прошлага часу. Сістэма формаў прошлага часу ў помніках усходнеславянскага пісьменства: простыя (аорыст, імперфект) і складаныя (перфект, плюсквампер-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фект); іх утварэнне, спражэнне, часавае значэнне і адносіны да значэнняў трывання. Функцыі формаў прошлага часу дзеяслова ў кніжна-літаратурнай і вусна-гутарковай мове. Гісторыя формаў будучага часу (будучы просты, будучы складаны I, будучы складаны II); іх значэнне і спосабы выражэння.

Лады дзеяслова. Гісторыя формаў ірэальных ладоў: загаднага і ўмоўнага.

### *Тэма 11. Тыповыя разнавіднасці дзеяслоўных формаў і іх роля ў сказе*

Гісторыя дзеепрыметных формаў. Утварэнне і скланенне іменных і займенных дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану цяперашняга і прошлага часу ў пісьмовых помніках усходніх славян. Асаблівасці развіцця дзеепрыметных формаў у дзеепрыслоўі ў беларускай мове. Абмежаванасць ужывання дзеепрыметнікавых формаў у сучаснай беларускай мове.

Функцыі дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў у гістарычным сінтаксісе ўсходніх славян.

### *Тэма 12. Прыслоўе. Утварэнне, значэнне і сінтаксічная роля ў сказе. Ступені параўнання прыслоўяў*

Асаблівасці фарміравання прыслоўя як часціны мовы. Словаўтварэнне і значэнне прыслоўяў. Ступені параўнання прыслоўяў.

Сінтаксічная роля прыслоўяў у беларускіх пісьмовых помніках.

### *Тэма 13. Службовыя словы. Выклічнікі*

Прыназоўнікі, злучнікі, часціцы ў гісторыі беларускай мовы. Іх роля ў старажытным сказе. Выклічнікі і іх гісторыя.

## Раздзел 3. Сінтаксіс

### *Тэма 14. Гісторыя развіцця сказаў у сінтаксічным ладзе беларускай мовы*

Развіццё розных тыпаў простых сказаў у помніках усходнеславянскага пісьменства. Гісторыя намінатыўных сказаў. Метады гістарычнага даследавання сінтаксічных з’яў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблема складанага сказа ва ўсходнеславянскіх гаворках старажытнага часу. Сродкі злучэння і падпарадкавання ў складаных сказах. Складаназлучаныя, складаназалежныя і бяззлучнікавыя сказы ў гісторыі беларускага сінтаксісу.

Спосабы і сродкі перадачы простай і няўласна-простай мовы ў гісторыі сінтаксічнага ладу беларускай мовы.

## Раздзел 4. Літаратурная мова ўсходніх славян XI – пачатку XIV ст.

### *Тэма 15. Гісторыя ўзнікнення пісьма і паходжання літаратурнай мовы ўсходніх славян*

Узнікненне пісьменнасці ва ўсходніх славян. Паходжанне літаратурнай мовы ўсходніх славян (тэорыі А.А.Шахматава, С.П.Абнорскага, В.У.Вінаградава, Ф.П.Філіна).

Стылістычныя разнавіднасці літаратурнай мовы ўсходніх славян: а) кніжнаславянскі стыль; б) народна-літаратурны стыль; в) дзелавы стыль.

Структурныя адрозненні царкоўнаславянскай (стараславянскай) і старажытнарускай моў. Роля царкоўнаславянскай мовы ў тагачаснай літаратурна-моўнай творчасці ўсходніх славян і ў выпрацоўцы правапісна-граматычных нормаў.

### *Тэма 16. Моўныя асаблівасці пісьмовых помнікаў XI–XIII стст., створаных на тэрыторыі сучаснай Беларусі*

Агляд пісьмовых помнікаў XI–XIII стст., створаных на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Характарыстыка мовы помнікаў усходнеславянскага пісьменства (казанні Іларыёна і Кірылы Тураўскага, жыційная літаратура, гістарычныя аповесці, летапісы, творы У.Манамаха, “Слова пра паход Ігараў”, “Руская праўда”).

Развіццё літаратурнай мовы ўсходніх славян ва ўмовах утварэння новых феадальных аб’яднанняў у XII–XIII стст. Уплыў регіянальных помнікаў на фарміраванне асобных усходнеславянскіх літаратурных моў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 5. Старабеларуская літаратурная мова

### *Тэма 17. Функцыянальна-стылістычныя разнавіднасці старабеларускай літаратурнай мовы (на матэрыяле помнікаў пісьменства XIV–XVIII стст.)*

Фарміраванне беларускай народнасці і яе мовы ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Асноўныя этапы развіцця старабеларускай літаратурнай мовы.

Літаратурна-пісьмовыя помнікі XIV ст. Функцыянальна-стылістычныя разнавіднасці літаратурнай мовы ва ўмовах фарміравання беларускай народнасці. Шляхі папаўнення лексічнага і фразеалагічнага фонду старабеларускай літаратурнай мовы. Выпрацоўка граматычна-правапісных асаблівасцей старабеларускай літаратурнай мовы і замацаванне спецыфічных сродкаў і прыёмаў літаратурнага выказвання.

Узнікненне і распаўсюджанне кнігадрукавання ў Беларусі. Значэнне выдавецкай дзейнасці Ф.Скарыны, С.Буднага, В.Цяпінскага. Сацыяльныя функцыі старабеларускай літаратурнай мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Функцыянальна-стылістычная дыферэнцыяцыя старабеларускай літаратурнай мовы помнікаў XIV–XVIII стст. Асаблівасці мовы юрыдычна-дзелавых помнікаў на беларускай мове (“Літоўская метрыка”, “Статуты ВКЛ”).

Моўна-стылістычныя асаблівасці арыгінальнай і перакладной мастацкай літаратуры, палітычнай сатыры, летапісаў, навуковай і гістарычна-мемуарнай прозы, палемічных твораў, перакладаў і арыгінальных помнікаў рэлігійнай літаратуры, а таксама іншых твораў XIV–XVIII стст., напісаных на так званай “рускай”, або “простай” мове; іх значэнне для гісторыі старабеларускай літаратурнай мовы.

Царкоўнаславянская кніжна-літаратурная мова (так званы “словенский”, “словянороский язык”) у Беларусі ў XIV–XVIII стст.; сферы яе выкарыстання. Пытанне аб беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы. Другі паўднёваславянскі ўплыў; станоўчыя і адмоўныя бакі гэтага ўплыву; яго адлюстраванне ў помніках беларускага пісьменства. Роля царкоўнаславянскай мовы ў развіцці беларускай літаратурнай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 18. Агляд філалагічных прац і ўмоў развіцця пісьменнасці на беларускай мове ў XVI–XVIII стст.*

Першыя буквары, граматыкі і слоўнікі ў Беларусі, іх роля ва ўстанаўленні норм літаратурна-кніжнай мовы і ўплыў на пазнейшую распрацоўку ўсходнеславянскіх моў. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў канцы XVI–XVII ст. Вынікі заняпаду пісьменнасці на беларускай мове ў канцы XVII ст.

Зараджэнне новых формаў і прыёмаў літаратурнага выказвання. Беларускія інтэрмедыі XVII–XVIII стст. як форма адыходу ад традыцый старабеларускай літаратурнай мовы. Канчатковае спыненне развіцця старабеларускай літаратурнай мовы.

## Раздзел 6. Новая беларуская літаратурная мова

### *Тэма 19. Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай культуры, літаратуры і мовы ў пачатку XIX ст.*

Гістарычныя ўмовы фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы. Развіццё беларускай культуры, літаратуры і мовы ва ўмовах адсутнасці беларускай дзяржаўнасці. Беларуская літаратура і кнігадрукаванне ў XIX ст.

Мастацкая літаратура як асноўная сфера фарміравання і развіцця новай беларускай літаратурнай мовы. Моўныя асаблівасці беларускіх твораў пісьменнікаў першай палавіны XIX ст. (вершаваныя апавяданні, паэмы “Энеіда навыварат”, “Тарас на Парнасе”).

### *Тэма 20. Фарміраванне беларускай літаратурнай мовы ў другой палавіне XIX – пачатку XX ст.*

Асаблівасці фарміравання беларускай літаратурнай мовы ў другой палавіне XIX ст. Роля В.Дуніна-Марцінкевіча і Ф.Багушэвіча ў фарміраванні беларускай літаратурнай мовы.

Публіцыстыка на беларускай мове ў другой палавіне XIX ст. (так званыя “гутаркі”, нелегальная друкаваная газета К.Каліноўскага “Мужыцкая праўда” і інш.), яе моўна-стылістычныя асаблівасці.

Беларускае кнігадрукаванне ў пачатку XX ст. і граматычна-правапісныя асаблівасці тагачасных беларускіх выданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Крыніцы папаўнення літаратурнай лексікі і фразеалогіі. Моўна-стылістычныя асаблівасці выданняў на беларускай мове.

Навуковыя распрацоўкі мовы ў дакастрычніцкі час; іх значэнне для ўзбагачэння выяўленчых сродкаў і нармалізацыі беларускай літаратурнай мовы.

### *Тэма 21. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў паслякастрычніцкі час*

Моўная сітуацыя ў Беларусі ў пачатку XX ст. Беларускае кнігадрукаванне і роля друкаваных органаў у станаўленні літаратурнай нормы.

Змены ва ўзаемаадносінах паміж літаратурнай мовай і рознымі адгалінаваннямі агульнанароднай мовы (тэрытарыяльнымі дыялектамі, прафесійнымі гаворкамі і жаргонамі). Кадыфікацыя граматычных нормаў і стварэнне адзінага дзяржаўнага правапісу. Замацаванне адзінай графічнай сістэмы і арфаэпічных нормаў.

Браніслаў Тарашкевіч. “Беларуская граматыка для школ” (1918) і яе роля ў распрацоўцы граматычна-правапісных нормаў беларускай літаратурнай мовы.

### *Тэма 22. Асаблівасці функцыянавання беларускай літаратурнай мовы ў 20–30-я гг. XX ст.*

Моўна-нацыянальная палітыка 20-х гг. XX ст. Беларусізацыя. Барацьба за чысціню і выразнасць беларускай літаратурнай мовы. Лексікаграфічныя працы гэтага часу.

Роля Я.Купалы і Я.Коласа ў развіцці лексікі, фразеалогіі і стылістычных сродкаў беларускай літаратурнай мовы. Пурызм 20-х гг. Выпрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі.

Выпрацоўка і замацаванне графічных, граматычна-правапісных і арфаэпічных нормаў беларускай літаратурнай мовы ў 20–30-я гг. XX ст. Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі (1926). Пастанова ўрада БССР “Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу” (1933) і яе адлюстраванне ў моўнай практыцы беларускага друку.

### *Тэма 23. Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе развіцця*

Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў другой палавіне XX ст. Змены ў правапісе пасля 1957 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праблемы нацыянальнага і культурнага функцыянавання беларускай літаратурнай мовы. Закон “Аб мовах у Беларускай ССР (1990)”, “Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларускай ССР” (1990). Дыскусіі 90-х (Рэспубліканская навуковая канферэнцыя “Праблемы беларускага правапісу” (лістапад 1992)). Моўная сітуацыя пасля рэферэндуму 1995 г. Праект новай рэдакцыі правапісу беларускай мовы (1999, 2004).

Перспектывы развіцця беларускай літаратурнай мовы ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту. Закон РБ “Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Анічэнка,У. В.* Гістарычная лексікалогія ўсходнеславянскіх моў: вучэб. дапам. / У. В. Анічэнка. – Гомель: ГДУ, 1978. – 94 с.

2. *Анічэнка, У. В.* Гістарычная фанетыка ўсходнеславянскіх моў: вучэб. дапам. / У. В. Анічэнка. – Гомель: ГДУ, 1982. – 112 с.

3. *Беларуская* мова: энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1994. – 655 с.: іл.

4. *Булыка, А. М.* Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, І. І. Крамко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 328 с.

5. *Жураўскі, А. І.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы: у 2 т. / А. І. Жураўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1967. – Т.1. – 371 с.

6. *Плотнікаў, Б. А.* Кароткая гісторыя беларускай мовы і мовазнаўства: вучэб. дапам. / Б. А. Плотнікаў. – Мінск: Акад. кіравання пры Прэзідэнце Рэсп. Беларусь, 2002. – 103 с.

7. *Янкоўскі, Ф. М.* Гістарычная граматыка беларускай мовы: вучэб. дапам. / Ф. М. Янкоўскі. – 3-е выд., выпр. – Мінск: Выш. шк., 1989. – 301 с.

*Дадатковая*

1. *Баханькоў, А. Я.* Развіццё лексікі беларускай літаратурнай мовы ў савецкі перыяд: сацыялінгвіст. нарыс / А. Я. Баханькоў. Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 231 с.

2. *Булыка, А. М.* Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст. / А. М. Булыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 256 с.

3. *Булыка, А. М.* Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы / А. М. Булыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1970. – 175 с.

4. *Воўк-Левановіч, О. В.* Лекцыі па гісторыі беларускай мовы / О. В. Воўк-Левановіч. – Мінск: Нар. асвета, 1994. – 205 с. – (Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*5. Гістарычная* лексікалогія беларускай мовы / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа; [рэд.: А.Я. Баханькоў і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1970. – 339 с.

*6. Гіруцкі, А. А.* Да характарыстыкі моўнай сітуацыі ў БССР / А. А. Гіруцкі // Беларуская лінгвістыка. – 1980. – Вып. 18. – С. 14–21.

*7. Гісторыя* беларускай літаратуры: Старажытны перыяд / пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Смяновіча. – 3-е выд. – Мінск: Выш. шк., 1997. – 351 с.

*8. Губкіна, А.* Перыяд 20-х гадоў XX ст. у развіцці беларускай мовы / А. Губкіна // Роднае слова. – 2006. – № 11. – С. 34–36.

*9. Закон* "Аб мовах у Беларускай ССР" // Беларуская мова: энцыклапедыя. – Мінск, 1994. – С. 647–653.

*10. Карский, Е.Ф.* Белорусы: Язык белорусского народа / Е. Ф. Карский. – М.: Изд-во АН СССР, 1955. – Вып. 1. – 475 с.; 1956. – Вып. 2-3. – 518 с.

*11. Карский, Е. Ф.* Белорусы: в 3 т. / Е. Ф. Карский. – М., 1956. – Т. 3. – 250 с.

*12. Крамко, І. І.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы / І. І. Крамко, А. К. Юрэвіч, А. І. Яновіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1968. – Т. 2. – 342 с.

*13. Красней, В. П.* Практыкум па гісторыі беларускай літаратурнай мовы: вучэб. дапам. для філал. фак-таў ВНУ / В. П. Красней, Л. М. Шакун. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1978. – 135 с.

*14. Красней, В. П.* Практыкум па гісторыі беларускай мовы: вучэб. дапам. для філал. фак-таў ВНУ / В. П. Красней, Л. М. Шакун. – 2-е выд. дапрац. – Мінск: Універсітэцкае, 1986. – 208 с.

*15. Мова* беларускай пісьменнасці, XIV–XVIII стст. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 319 с.

*16. Шакун, Л. М.* Карані роднай мовы: выбр. працы па гісторыі бел. мовы / Л. М. Шакун. – Мінск, 2001. – 205 с.

*17. Шакун, Л. М.* Рэформа правапісу і граматыкі 1933 года / Л. М. Шакун // Гісторыя беларускага мовазнаўства / Л. М. Шакун. – Мінск, 1995. – С. 133–149.

*18. Шакун, Л. М.* "Беларуская граматыка для школ" Б. Тарашкевіча / Л. М. Шакун // Гісторыя беларускага мовазнаўства / Л. М. Шакун. – Мінск, 1995. – С. 125–133.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

19. *Шакун, Л. М.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы: вучэб. дапам. для філал. фак-таў ВНУ / Л. М. Шакун. – Мінск: Універсітэцкае, 1984. – 318, [1] с.

20. *Шакун, Л. М.* Гісторыя беларускага мовазнаўства: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак-таў ВНУ / Л. М. Шакун. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 271 с.

21. *Яновіч, А. І.* Графіка-арфаграфічныя і граматычныя асаблівасці беларускіх выданняў пачатку XX стагоддзя / А. І. Яновіч // Беларуская мова: энцыклапедыя. – Мінск, 1994. – С. 163–165.

22. *Янович, Е. И.* Историческая грамматика русского языка: учеб. пособие / Е. И. Янович. – Минск: Университетское, 1986. – 319 с.

23. *Яскевіч, А. А.* Абранне вечнасці: Універсалізм традыцыі і гістарызм сучаснасці / навук. рэд., паслясл. І. Я. Квін. – Мінск: Выд. дзярж. прадпрыемства "Маст. літ.", 1999. – 317, [2] с.

24. *Яскевіч, А. А.* Старабеларускія граматыкі: Да прабл. агульнафілал. цэласнасці / А. А. Яскевіч, Акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 1996. – 352 с.

25. *Хрэстаматыя* па гісторыі беларускай мовы / [рэд. Р. Аванесаў]. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1961. – Т. 1. – 539 с.; 1962. – Т. 2. – 327 с.

*Слоўнікі*

1. *Гістарычны* слоўнік беларускай мовы / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990.

2. *Насовіч, І. І.* Слоўнік беларускай мовы / І. І. Насовіч. – Мінск: БелСЭ імя П. Броўкі, 1983. – 756, [22] с.

3. *Падручны* слоўнік старабеларускай літаратурнай мовы: каля 4000 лексем / установа адукацыі "Віцеб. дзярж. ун-т імя П. М. Машэрава". – Віцебск: Выд-ва ВДУ, 2004. – 94 с.

4. *Старабеларускі* лексікон: падруч. пер. слоўн. – Мінск: Бел. выд-ва т-ва "Хата", 1997. – 174, [1] с.

5. *Старабеларускія* лексіконы: "Лексисъ съ толкованіемъ словенскіх мовъ просто". "Лексис..." Л. Зізанія. "Синонима славеноруская" / уклад., рэканструкцыя, сучас. правапіс.-граф. упарадкаванне тэкстаў, прадм., паслясл. і камент. А. А. Яскевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 174 с. – (Са скарбніцы беларускай культуры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11- 04 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка)*
*спецыялізацыі 1-23 01 11- 04 01Беларуская мова і літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2012 г. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,75.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.